**Г.С. Дымовіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі гімназіі №1 г. Бярозаўкі
Лідскага раёна Гродзенскай вобласці

# Сістэмны падыход у падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды па беларускай мове

Сістэмны падыход з'яўляецца адным з метадалагічных падыходаў да арганізацыі адукацыйнага працэсу. Яго сутнасць у навучанні звязана з такімі філасофскімі катэгорыямі, як цэласнасць і развіццё. Менавіта развіццё вучня, а тым больш, калі ён адораны, з’яўляецца адной з важнейшых задач настаўніка. Кожны мае свае погляды, падыходы да вырашэння гэтага пытання, але бясспрэчна адно: калі ёсць сістэма ў такой рабоце, тады будзе і поспех.

Вядома, работу з адоранымі вучнямі па падрыхтоўцы да алімпіяды па беларускай мове неабходна праводзіць не толькі на ўроках, але і на факультатыўных занятках, а таксама на занятках алімпійскай групы.

У пачатку навучальнага года я склала план дзейнасці з групай вучняў шостых класаў гімназіі (якія маюць павышаную матывацыю да навучання), які ўключаў у сябе дзейнасць вучняў на ўроку і на занятку алімпійскай групы. Для яго рэалізацыі на кожна ўрок і занятак я рыхтавала індывідуальныя заданні. У выніку такой працы атрымаўся метадычны дапаможнік, складзены па тэматычнаму прынцыпу з заданнямі і адказамі. Для работы выкарыстоўваліся гатовыя заданні з дапаможнікаў **Кулеш, Г.І.** Рэпетытар па беларускай мове: марфалогія і правапіс: для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / Г.І.Кулеш, Г.К. Ціванова.-Мінск: Аверсэв, 2009.-192с.; Малажай, Г.М. Беларуская мова: Тыповыя памылкі на цэнтралізаваным тэсціраванні / Г.М.Малажай, А.В.Дзябёлая, Л.В.Леванцэвіч.-Мінск: Аверсэв, 2007.-208с.; Сіўковіч, В.М. Беларуская мова ў пытаннях і адказах: дапаможнік для вучняў старэйшых класаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання / В.М. Сіўковіч. – 6-е выд., дапоўненае. – Мінск: УніверсалПрэс, 2009. – 600 с.

У метадычным дапаможніку знайшлі адлюстраванне тэмы з узгаданых вышэй дапаможнікаў з раздзела «Марфалогія», якія адпавядаюць праграме 6 класа, а таксама заданні раённых алімпіяд для дзяцей дадзенага ўзросту.

Для таго каб убачыць як арганізавана дзейнасць вучняў на ўроку і занятку алімпійскай групы, прапаную распрацоўкі.

## Урок беларускай мовы ў 6 класе

**Тэма: Падагульненне і сістэматызацыя ведаў па тэме «Займеннік»**

**Мэты:**

- узгадаць і абагульніць веды пра займеннік як самастойную часціну мовы, асаблівасці яго ўжывання ў беларускай мове;
- удасканальваць уменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго віды, марфалагічныя асаблівасці, вызначаць сінтаксічную ролю ў сказе, ужываць ва ўласным маўленні;
- выхоўваць пачуццё любові да Радзімы.

**Тып урока:** урок-падарожжа.

**Абсталяванне**: малюнкі пралесак, карткі з заданнямі, ацэначныя карты.

**Дэвіз урока** (запісаны на дошцы): *Важна не тое, што і колькі ты зрабіў, а тое, як ты гэта зрабіў.*

**Эпіграф** (запісаны на дошцы): *Любіце гэту сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, дый не патрэбна* . (У. Караткевіч)

### Ход урока

**I. Арганізацыйны момант**

─ Паглядзіце ў акно. На вуліцы вясна. І мне захацелася, каб вясна была не толькі на вуліцы, але і ў нашым класе. Вы, напэўна, ведаеце, што першай прыкметай вясны з'яўляецца цёплае сонечнае надвор'е, калі пачынае таяць снег, пад нагамі бягуць ручайкі. «Зіма плача», – кажуць у народзе. А яшчэ адной з прымет надыходу вясны з'яўляюцца кветкі. Успомніце, якія першыя кветкі з'яўляюцца вясной?
*Вучань:* Пралескі.
─ Правільна. Той, хто сёння вельмі добра будзе працаваць на ўроку, атрымае ад мяне пралеску. У каго будзе найбольш кветачак, той атрымае 10 балаў.
─ Наша праца на ўроку будзе адбывацца пад дэвізам «Важна не тое, што і колькі ты зрабіў, а як ты гэта зрабіў». Гэта значыць, што ў першую чаргу я буду ацэньваць якасць зробленай вамі працы, а не колькасць выкананых практыкаванняў.
─ Акрамя таго, у кожнага з вас на сталах ёсць ацэначныя карты. Вы будзеце мець магчымасць кожнае выкананае заданне ацаніць самастойна. У канцы ўрока я прагледжу іх і, калі будзе неабходна, адкарэкцірую.

Ацэначная карта

| Назва задання | Эпіграф | Тэарэтычныя пытанні/ д.зад | Асабовыя займеннікі | Прыналеж-ныя займеннікі | Зваротны займеннік <u>сябе</u> | Азначаль-ныя і ўказаль-ныя займеннікі | Адносныя і пытальныя займеннікі | Няпэў-ныя і адмоўныя займеннікі | Агульны бал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Заданне 1 | Заданне 2 | Заданне 3 | Заданне 4 | Заданне 5 | Заданне 6 | Заданне 7 | Заданне 8 | |
| Адзнака | | | | | | | | | |

**II. Паведамленне тэмы, пастаноўка мэт і задач урока**
─ Паслухайце загадку і скажыце, пра што ў ёй гаворыцца.
*Маю некалькі ў мове нагрузак патрэбных:*
*Замяняю назоўнік, лічэбнік, прыметнік. (Адказы вучняў.)*
─ На ўроках мы з вамі пазнаёміліся з такімі іменнымі часцінамі мовы, як назоўнік, прыметнік, лічэбнік. А сёння мы ўзгадаем і абагулім веды пра часціну мовы, што можа замяняць усе раней згаданыя, хоць яна прадстаўлена адносна невялікай колькасцю слоў. Гэта часціна мовы – займеннік.
─ Т.ч., тэма ўрока ─ «Падагульненне і сістэматызацыя ведаў па тэме «Займеннік». Разгарніце сшыткі і запішыце дату, тэму ўрока. Паглядзіце яшчэ раз на тэму і сфармулюйце задачы ўрока. *(Адказы вучняў.)*
─ Мы будзем удасканальваць набытыя ўменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго разрады, марфалагічныя асаблівасці, правапіс, вызначаць сінтаксічную функцыю ў сказе і далей працягваць ужываць займеннікі ва ўласным маўленні.
І, канечне, на гэтым уроку мы з вамі будзем гаварыць пра нашу Радзіму, пра тое, як моцна яе любім. А зараз адпраўляемся ў падарожжа ў горад Займеннік. Каб патрапіць у гэты горад, трэба расшыфраваць пароль. Такім паролем будзе эпіграф нашага сённяшняга ўрока – словы выдатнага беларускага пісьменніка У. Караткевіча. (Чытанне эпіграфа, які запісаны на дошцы.)
─Як вы разумееце гэтыя радочкі?
**<u>Заданне 1</u>**: Паспрабуйце запісаць гэтыя радочкі па памяці, знайдзіце ў тэксце займеннікі і вызначце іх разрад.
Праверка задання (ключ на дошцы).
**III. Паўтарэнне і абагульненне**
**1. Франтальнае апытванне**
─ Такім чынам, мы паспяхова прайшлі праз вароты нашага казачнага горада Займеннік і зараз накіроўваемся ў аўтобус, каб наведаць самыя знакамітыя мясціны. Але вы ведаеце, што ў аўтобусе заўсёды трэба набываць білет, які па дарозе можа праверыць кантралёр. Такім кантралёрам на нашым шляху выступяць *тэарэтычныя пытанні*, адказаўшы на якія, мы будзем рухацца далей. Памятайце, што мы адказваем прыгожа, па-беларуску, на пытанні

даём поўныя адказы, падмацоўваючы іх прыкладамі. 2 вучні пойдуць да дошкі і выканаюць д/з (па варыянтах) – марф. разбор. Вучні, якія рыхтуюцца да алімпіяды, атрымліваюць індывідуальныя заданні:

**<u>Індывідуальные заданне №1</u>**

***Прыведзеныя ніжэй словы размяркуйце ў табліцу.***

Нейкі, гэты, мы, які, нішто, дзесьці, твой, іншы, які-небудзь, наш, нічый, кожны, як-небудзь, хтосьці, самы, ніякі, чый, хто, такі, ён, яны, кудысьці, хто-ніхто, як, свой, столькі, увесь, так-сяк, каторы, што-што, той, некаторы, той-сёй, неяк, любы.

| Займеннікі | | | | | | | Прыслоўі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| асабов. | прынал. | указальн. | азначальн. | пыт.- адн. | няпэўн. | адмоўн. | |
| | | | | | | | |

**<u>Заданне 2:</u>** Тэарэтычныя пытанні

1. Што такое займеннік?
2. На якія разрады паводле значэння падзяляюцца займеннікі?
3. На што ўказваюць асабовыя займенікі. Прывядзіце прыклады.
4. Які займеннік не мае формы назоўнага склону?
5. На што ўказваюць прыналежныя займеннікі? Прывядзіце прыклады.
6. Чаму лёгка зблытаць адносныя і пытальныя займеннікі?
7. На што паказваюць указальныя займеннікі? Прывядзіце прыклады.
8. Якое значэнне маюць азначальныя займеннікі? Прывядзіце прыклады.
9. Што выражаюць адмоўныя займеннікі? Прывядзіце прыклады.
10. Што абазначаюць няпэўныя займеннікі? Прывядзіце прыклады.
11. У ролі якіх членаў сказа могуць выступаць займеннікі? Прывядзіце прыклад сказа, каб займеннік выступаў у ролі дзейніка.
12. Якая роля займеннікаў у мове?

Падвядзенне вынікаў.

—Я бачу, што дома вы…

— А зараз мы з вамі рухаемся далей.

- Першы наш прыпынак – «**Асабовыя і прыналежныя займеннікі**».

**<u>Заданне на картках 3:</u>** Замяніце самастойныя часціны мовы на займеннікі (самастойна).

1. Мяне завуць Віктар. Віктар любіць чытаць дэтэктывы.
2. Каці прапанавалі працаваць дыспетчарам, хоць Каця толькі нядаўна прыйшла на фабрыку.
3. Наступіла вясна. Вясна адразу ўсміхнулася сонечнымі дзянькамі.
4. На 8 Сакавіка дзяўчынкам уручылі падарункі. Падарункі вельмі парадавалі дзяўчынак.
5. На бярозе вяліся буслы. З выраю буслы звычайна прыляталі ў красавіку.

**<u>Індывідуальнае заданне №2</u>**

Устаўце займеннік 2-й асобы адзіночнага ліку ў патрэбнай форме.

Расказаць пра______, абяцаць____, быць з _______, маўчаць пры______, здзекавацца з____, прыйсці да____,патэлефанаваць_________.

—Якімі займеннікамі мы з вамі замянілі назоўнікі?

*Вучань*: Асабовымі.

— Наступнае заданне знаходзіцца ў вас на картках. Чытаем яго ўмову.

**<u>Заданне на картках 4</u>:** Выразна прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку (асноўная думка заключаецца ў сказе з тэксту). Выпішыце з тэксту **прыналежныя займеннікі** (разам з назоўнікамі). Вызначце іх род, лік і склон. (Вучань каля дошкі разам з класам, потым усе выконваюць самастойна, а вучань прадаўжае.)

Мая Беларусь...

Галоўны твой скарб — людзі! Беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў: Сонца — на ўсіх адно, Зямля — адна, трымайся сваёй хаты, беражы свой гонар, не бяры чужое. Ніколі і нікому не ўдавалася зняволіць наш вольналюбівы народ, які ўслаўляе сваю зямлю, гаворыць усяму свету пра добрае сваё імя, імя яго радзімы.

Мая (Н., адз., ж.) Беларусь...

Галоўны твой (Н., адз., м.) скарб — людзі! Беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў: Сонца — на ўсіх адно, Зямля — адна, трымайся сваёй (Р., адз., ж.) хаты, беражы свой (В., адз., м.) гонар, не бяры чужое. Ніколі і нікому не ўдавалася зняволіць наш (В., адз., м.) вольналюбівы народ, які ўслаўляе сваю (В., адз., ж.) зямлю, гаворыць усяму свету пра добрае сваё (В., адз., н.) імя, імя яго радзімы.

Праверка задання: зверыць з запісам на дошцы.

**Фізхвілінка**

Устаньце, дзеткі, усміхніцеся,
Зямлі нашай пакланіцеся
За шчаслівы дзень учарашні.
Усе да сонца падцягніцеся,
Улева, управа ніхіліцеся,
Вераценцам пакруціцеся.
Раз прысядзьце, два прысядзьце
І за парты ціха сядзьце.

- Наступны прыпынак – «**Зваротны займеннік сябе**»

— Прачытайце, калі ласка, умову задання, змешчанага на картках, якія вы атрымалі.

**Заданне на картках 5:** Замест кропак пастаўце займеннік *сябе* ў патрэбнай форме. Вызначце яго склон.

З гадамі я навучыўся больш цаніць самога … . Трэба заўсёды старацца трымаць … ў руках. Не магу дараваць … такога неабдуманага ўчынку. Трэба непакоіцца не толькі пра … , але і пра іншых. Лепш адмовіць … ў чым-небудзь, чым свайму сябру.

Праверка задання: (самаправерка, ключ да задання)

**Інд.заданне №3**

**Упішыце зваротны займеннік у патрэбнай форме**.

Не падобны да_______ , смяяцца з _______ , не магу _______дараваць, вярнуцца да______ , трымаць пры___________ , прыехаць да_____ , гаварыць сам_____, вярнуць______.

- **«Азначальныя і ўказальныя займеннікі»**

—Успомніце, якія займеннікі адносяцца да азначальных?

Вучань: Да азначальных займеннікаў адносяцца *сам, самы, кожны, увесь, усё, іншы*.

—Што абазначаюць указальныя займеннікі? Пералічыце, калі ласка, указальныя займеннікі.

Вучань: Указальныя займеннікі ўказваюць на прадмет. Да іх адносяцца *той, такі, гэты, гэтакі, гэтулькі*.

**Заданне 6:** Паспрабуйце апісаць тое, што вы ўявілі, некалькімі сказамі, выкарыстоўваючы пры гэтым азначальныя і ўказальныя займеннікі.

Праверка задання: вучні зачытваюць створаныя імі тэксты.

**Фізхвілінка для вачэй**

- **«Адносныя і пытальныя займеннікі»**

**Заданне на картках 7:** Выразна прачытайце сказы. Знайдзіце і пазначце сказы з пытальнымі займеннікамі (П) і з адноснымі (А).

1. У дарогах знаёмяцца лёгка найбольш за ўсё тыя, хто любіць заглянуць у незнаёмы свет чужой душы. (Скр.)
2. Не баіцца яна ні замаразкаў, якія зацягваюць з ночы хрупасткім шкельцам лёду лужыны і канавы, ні снежных завірух, што разгуляюцца, бывае, і ў красавіку, ні галалёдзіцы, ад якой губляюць вецце нават асілкі-дубы (І. Н.)
3. Што яны падумаюць пра нас? (Ш.)
4. «Чыя гэта пасада? Хто жыве тут?» – запытаў настаўнік. (К-с)
5. Я марыў пабыць у абодвух гарадах, якія злучаў цягнік, што спыняўся на нашай невялікай станцыі толькі на адну хвіліну (І. Н.)

Адказ: пытальныя – у сказах 3, 4; адносныя – у сказах 1, 2, 5;

- **«Няпэўныя і адмоўныя займеннікі»**

**Заданне на картках 8:** Запішыце правільна няпэўныя займеннікі і адмоўныя.

Не(?)хта, не(?)шта, нечы(?), што(?)сьці, які(?)сь, чый(?)сьці, абы(?)які, які(?)небудзь, каму(?)небудзь, абы(?)каго, абы(?)з(?)чым, абы(?)з(?)кім, ні(?)хто, ні(?)чый, ні(?)які, ні(?)ў(?)каг**о**, ні (?)ў(?)к**о**га.

**Індывідуальнае заданне №4**

Раскрыйце дужкі. Пастаўце займеннікі ў патрэбную форму.

З (хто-небудзь), у (хтосьці), у (якісьці), з (абы-хто), у (абы-які), на (абы-што), пра (хтосьці), пра (якісьці), пра (ніхто), па (штосьці), па (якісьці), у(ніхто), пры(нішто), у (штосьці), у (абы-што).

Адказ: з кім-небудзь, у кагосьці, у якімсьці, абы з кім, абы ў якім, абы на чым, пра кагосьці, пра якогасьці, ні пра кога, па чымсьці, па якімсьці, ні ў кога, ні пры чым, у чымсьці, абы ў чым.

Праверка задання: ключ

─ Ну вось нашае падарожжа, на жаль, скончылася і павінны вярнуцца дадому.

**IV. Дамашняе заданне**

Параграф 53, практ.403 ; па жаданню ─ творчае заданне: падрыхтаваць картку з заданнем і асобна з адказам да яго па тэмах «Правапіс займеннікаў», «Скланенне займеннікаў»; крыжаванку па тэме «Займеннік».

**V. Абагульненне** (абагуліць разам з вучнямі), рэфлексія.

─Што выклікала цяжкасці, што было цікавае, запамінальнае?

─Каму яшчэ трэба звярнуцца да правілаў і што паўтарыць? (вучні выказваюцца пра сваю работу на ўроку).

─Дайце ацэнку сваёй рабоце.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока**

Пракаменціраваць усе адзнакі, даць парады тым, у каго не ўсё атрымалася.

## Занятак алімпійскай групы

**Тэма: Займеннік як часціна мовы.**

**Мэта:** узгадаць і абагульніць веды пра займеннік, асаблівасці яго ўжывання ў беларускай мове; удасканальваць уменні выдзяляць займеннік сярод іншых часцін мовы, характарызаваць яго віды, марфалагічныя асаблівасці, правапіс займеннікаў, ужываць у кантэксце.

**1.Арганізацыйны момант. Знаёмства з тэмай, задачамі занятку**

**2. Актуалізацыя ведаў па тэме «Займеннік»**

***Тэст***

*1.Вызначце, якое азначэнне правільнае.*

а) Займеннік — часціна мовы, якая абазначае лік, колькасць прадметаў або іх парадкавае месца;

б)Займеннік — часціна мовы, якая ўказвае на прадмет, якасць і колькасць, не называючы іх;

в) Займеннік — часціна мовы, якая характарызуецца значэннем прадметнасці.

*2.Адзначце, замест якіх часцін мовы могуць ужывацца займеннікі.*

а) назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў;

б)прыслоўяў, злучнікаў, дзеясловаў;

в) прыназоўнікаў, часціц, выклічнікаў.

*3.Адзначце сказ, у якім выдзелены займеннік указвае на прадмет.*

а) *Наша* вёска знакамітая сваімі людзьмі.

б)*Кожны* марыць пра лепшае жыццё.

в) *Якая* прыгожая вясна!

*4.Адзначце рад, у якім усе займеннікі аднаго разраду.*

а) мой, ваш, каторы, свой;

б)гэтакі, столькі, той, самы;

в) абы-што, чыйсьці, некаторы, нехта.

*5.Адзначце рад, у якім склон займенніка вызначаны няправільна.*

а) прынёс ёй (Д.);

б)аддаў нам (В.);
в) паклікаў да сябе (Р.).
*6. Знайдзіце ў сказе займеннік, які мае наступную характарыстыку: прыналежны, ужыты ў жаночым родзе адзіночным ліку родным склоне.*
Памяць чалавека падобна на скарбніцу, у якой можа захавацца толькі тое, што здольна вытрымаць буры часу і не страціць сваёй цікавасці.
а) сваёй;
б)у якой;
в) тое.
7.Адзначце рад слоў, у якіх замест кропак трэба паставіць літару *е.*
а)н..чога новага, н..кому н..чога не сказаў;
б)н..чага не хапала, н..хта зацягнуў песню;
в)н..якіх довадаў няма, н..хто не адмовіўся.
8.Адзначце сказ, у якім сінтаксічная роля займенніка вызначана няправільна.
а)*Нехта*(дзейнік) спяшаецца дадому.
б)*Нам*(дапаўненне) трэба ісці ў школу.
в)У *кожнай*(акалічнасць) школе гарыць свой агеньчык.
9.Адзначце сказ, у якім трэба ўжыць займеннік сябе.
а)Ён не змог узяць на ... такую адказнасць.
б)А ён уважліва слухаў і матаў ... на вус.
в)Мы, здаецца, ніколі ні бацькам, ні ... не хлусілі.
10.Запішыце два сказы, ужываючы займеннік *іх* у першым сказе як асабовы, а ў другім — як прыналежны.
Адказ:

| Нумар задання | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Правільны адказ | б | а | б | в | б | а | б | в | а |

Варыянт выканання задання №10:
Самыя цікавыя кнігі былі ў нас, і мы *іх* (асабовы) з рук не выпускалі.
Яны гаварылі доўга, і канца *іх* (прыналежны) гаворкі я не чуў.
**3.Знаёмства з тыпалогіяй алімпіядных зададанняў па тэме «Займеннік»**
А) Правапіс часціц **не** або **ні** з займеннікамі.
Б) Ужыванне займеннікаў **сам** або **самы.**
В) Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы.
Г) Памылкі ва ўжыванні займеннікаў.
**А) Правапіс часціц** не **або** ні **з займеннікамі**
**Тлумачэнне настаўніка.** У сцвярджальных сказах ужываюцца спалучэнні **не хто іншы, як; не што іншае, як** і выконваюць ролю ўзмацняльных часціц (толькі, іменна), таму членамі сказа не з’яўляюцца: дапаможа не хто іншы, як бацька; гэта было не што іншае, як абяцаная кніга.
У адмоўных сказах ужываюцца спалучэнні **ніхто іншы не**, **нішто іншае не**, дзе займеннікі **ніхто,нішто** выконваюць ролю дзейніка або дапаўнення, **іншы** – азначэння, часціца **не** ўжываецца пры выказніку: ніхто іншы не мог так дапамагчы; нішто іншае цяпер мяне не цікавіла.
**Аналіз заданняў:**
1.(Не, ні) хто іншы, як дырэктар школы прадставіў Андрэя Вітальевіча калектыву школы. — ***Не*** *хто іншы, як дырэктар школы прадставіў Андрэя Вітальевіча калектыву школы.*
2.Максім умеў катацца на каньках, як (не, ні) хто іншы ў класе.—*Максім умеў катацца на каньках, як* ***ні****хто іншы ў класе.*

3.Мы былі рады, што Уладзімір Пятровіч, а (не, ні) хто-небудзь іншы, павязе нас на экскурсію. — *Мы былі рады, што Уладзімір Пятровіч, а* ***не*** *хто-небудзь іншы, павязе нас на экскурсію.*

**Б) Ужыванне займеннікаў** сам **або** самы**.**

**Тлумачэнне настаўніка.** Займеннік **сам** паказвае на асобу ці прадмет, што самастойна ўтвараюць дзеянне: сам старшыня прыехаў, і **самы** , які паказвае на крайнюю мяжу ў прасторы ці часе і выкарыстоўваецца пры ўтварэнні складанай формы найвышэйшай ступені параўнання: да самага вечара, самае высокае дрэва.

Ва ўскосных склонах у займенніку **сам** націск падае на канчатак: самога, самому, самім, а ў займенніку **самы** – на аснову: самага, самаму,самым. (Звярнуць увагу вучняў на скланенне займенніка сам і самы ў падручніку на стар.199)

**Аналіз заданняў:**

1.Хлопцы не хацелі верыць, што стол зроблены мною (самым, самім). — *Хлопцы не хацелі верыць, што стол зроблены мною самім.*

2.З (самай, самой) раніцы дзьмуў халодны вецер. — *З самай раніцы дзьмуў халодны вецер.*

3. (Самага, самога) загадчыка аддзела ў кабінеце не было.*Самога загадчыка аддзела ў кабінеце не было.*

4.Каля (самага, самога) берага рэчкі расла стройная бяроза. — *Каля самага берага рэчкі расла стройная бяроза.*

**В) Ужыванне займеннікаў у ролі іншых часцін мовы**

**Тлумачэнне настаўніка.** Такі пераход магчымы, калі займеннікі страчваюць сваё значэнне агульнасці і набываюць значэнне іншай часціны мовы, што ўплывае на іх ролю ў сказе: ***Нашы*** *перамаглі. За сталом сядзелі толькі* ***сваe.***

Займеннікі лёгка субстантывуюцца (становяцца назоўнікамі), а таксама могуць пераходзіць у разрад часціц.

<u>Пераходзяць у назоўнікі наступныя займеннікі:</u>

-азначальныя *(усё, усе, усякі, кожны, іншы, сам*), ужытыя без назоўніка: *Адзін за* ***ўсіх, усе*** *- за аднаго.* (Прым.) ***Кожны*** *адказвае сам за сябе;*

-прыналежныя займеннікі *мой, твой, свой, наш, ваш: Яна пазнала* ***сваіх*** *і шчыра ўзрадавалася.* (Шам.) Займеннікі *мой, мая* маюць значэнне 'муж', 'жонка': *Зараз павінен* ***мой*** *вярнуцца..:* (К. К);

-указальныя займеннікі *той, гэты,* калі не паясняюць назоўнікаў: *І* ***гэта*** *больш за ўсё непакоіла Міхася.* (Луж.)

<u>У ролі часціц ужываюцца:</u>

- зваротны займеннік *сябе* ў форме *сабе* як узмацняльная часціца: ***Мужчына*** *смяецца, а Паўлюк* ***сабе*** *толькі маўчыць...* (Б.);

- указальны займеннік *гэта: А мы толькі* ***гэта*** *разгаварыліся. (С.);*

-займеннік *усё: Снег* ***усё*** *ішоў і ішоў;*

-займеннікі *штосьці (штось): Мне* ***штось*** *- не спалася.*

**Г) Памылкі ва ўжыванні займеннікаў**

**Аналіз заданняў:**

1.Сёння зранку купілі цябе новую цёплую куртку. — *Сёння зранку купілі* ***табе*** *новую цёплую куртку.*

2.З гадамі я навучылася больш цаніць сабе саму. — *З гадамі я навучылася больш цаніць* ***сябе*** *саму.*

3.Трэба было набыць **сабе** новы слоўнік. *(Правільна.)*

4. Я пазнаю табе ў нашым сыне. — *Я пазнаю* ***цябе*** *ў нашым сыне.*

5.Табе ніколі не цікавілі мае праблемы. — ***Цябе*** *ніколі не цікавілі мае праблемы.*

**3. Міні-алімпіяда**

***1) Напішыце не або ні разам ці асобна.***

1.(Не, ні) чым іншым Марына, акрамя цудоўнага голасу, не вызначалася.

2.Нашы пошукі пакінутага ў лесе кошыка з'яўляліся (не, ні) чым іншым, як пустой тратай часу.
3.(Не, ні) чым іншым, акрамя біялогіі, ён не цікавіўся.
4.З-за ўзгорка паказалася (не, ні) што іншае, як вёска Мажэйкава.
5.Такое магло прыйсці ў галаву (не, ні) кому іншаму, як Данікv.

***2) Выберыце патрэбную граматычную форму займеннікаў*** *сам* ***або*** *самы.*

1.Уся работа выконвалася імі (самымі, самімі).
2.Максім карыстаўся павагай у (самага, самога) начальніка турыстычнага клуба.
3.(Самым, самім) высокім дрэвам у вёсцы была таполя.
4.Узнагарода была ўручана (самым, самім) прэзідэнтам клуба.
5.Яна шкадавала, што не магла гэтага расказаць (самаму, самому) блізкаму чалавеку.

***3) Пастаўце ў дужкі адпаведную лічбу: 1 - пасля займенніка, 2 - пасля займенніка ў ролі назоўніка, 3 - пасля займенніка ў ролі часціцы.***

1. Яго ўсякі ( ) гоніць, усякі ( ) ушчувае. (К-с)
2. Ці не вецер гэта ( ) звонкі ў тонкіх зёлках шапаціць? (М. Б.)
3. Мая ( ) ездзіла на тым тыдні ў Мінск. (Б.)
4. Птушкі маюць сваю ( ) дарогу. (Ц.)
5. Дачуўся я, што нашы ( ) за Эльбаю, і падаўся туды, да сваіх ( ). (Сач.)
6.І жыў там араты з Агатай сваёй ( ) і дачкою. (К.)
7. А хіба ж гэта ( ) Юзік не быў тут? (К. К.)
8. Штосьці ( ) нас забыў саколік, мо не вернецца ніколі. (Бяд.)
9. Шушукне штосьці ( ) хвайняком і падыхне, ды так глыбока, паблеклым травам, лазнякам. (К-с)
10. Дзе маё ( ) не прападала. (К. К.)

Адказ: 1 -2,2; 2-3; 3-2; 4-1; 5-2,2; 6-1; 7-3; 8-у ролі прыслоўя; 9-1; 10-2.

***4) Знайдзіце памылкі і запішыце займеннікі правільна.***

Ён з маяго класа; ты запісаў у сваём сшытку; мы перадалі тваяму сябру; яна дастала са сваяго партфеля; аб ком табе расказаць; гэта я вычытаў з нечыяга сачынення; у яком практыкаванні такая памылка; пасля столькага намагання нічога не атрымалася; у чыём акне гэтае святло; сустрэўся з усемі сваймі аднакласнікамі; на том беразе ракі столькі кветак.
*Адказ:* З ма*й*го класа; у сва*і*м сшытку; тва*й*му сябру; са сва*й*го партфеля; аб к*і*м расказаць; з неча*га* сачынення; у як*і*м практыкаванні; пасля столь*кіх* намагання*ў*; у чы*і*м акне; з ус*і*мі сва*і*мі аднакласнікамі; на т*ы*м беразе.

**4. Падвядзенне вынікаў занятку.**